СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ!

Бібліотэка АН БССР

Прачытаў—перадай другому.

# НАРОДНЫ МСЦІВЕЦ

Орган Окцябрскага РК КП(б)Б

№ 15 (36) | Панядзелак, 21 чэрвеня 1943 г. | II г. выд.

## Для абароны Радзімы

Далучаючыся да ўзнятага патрыятычнага ўздыму савецкага народа, партызаны атрада Александра А. падпісаліся на Другую Дзяржаўную Ваенную Пазыку на 1500 рублёў. Падпіска працягваецца.

Аддадзім свае сродкі для хутчэйшага разгрому заклятага ворага!

## З паведамленняў Совінфармбюро

[Агляд з 12 па 20 чэрвеня].

Паўночна-заходней Мцэнска праціўнік аднавіў атакі з мэтай звярнуць страчаныя ім населеныя пункты. Палонныя салдаты паказваюць, што ім была пастаўлена задача любой цаной аднавіць становішча. Нашы байцы адбіваюць жорсткія атакі і прадаўжаюць утрымліваць занятыя пазіцыі. Нанесены сур'ёзныя страты ў жывой сіле і тэхніцы тром батальёнам праціўніка. Палявой і зенітнай артылерыяй падбіта 5 танкаў і збіта 4 нямецкіх самалёты.

У р-не Белгарада батальён нямецкай пяхоты пытаўся захапіць высату і рошчу, якія абараняла падраздзяленне старшага лейтэнанта тав. Глобец. Нашы байцы адбілі атаку і знішчалі да 120 нямецкіх салдат і афіцэраў. Захвачана 8 кулямётаў, 70 вінтовак і іншае ўзбраенне.

За мінуўшую надзелю, з 13 па 19 чэрвеня ўключна, у паветраных баях, агнём зенітнай артылерыі і войск знішчана 276 нямецкіх самалётаў.

## Налёты нашай авіяцыі

У ноч на 12 чэрвеня буйныя сілы нашай авіяцыі дальняга дзеяння нанеслі новы магутны ўдар па аэрадромах праціўніка. На знаходзіўшыеся на аэрадромах нямецкія самалёты, ангары, склады гаручага, боепрыпасаў і на лётныя палі аэрадромаў скінута больш 600 тон фугасных і запальваючых бомб. Адзначана больш 100 пажараў.

У ноч на 13 і 16 чэрвеня авіяцыя дальняга дзеяння зрабіла налёты на чыгуначныя вузлы Гомель, Бранск, Орол, Унеча, Новазыбкаў, Рослаўль, Уладзіслаўка і станцыю Карачэў. Бамбардыроўцы былі падвергнуты скапленні эшалонаў праціўніка. Выкліканыя бамбардыроўкай шматлікія пажары суправаджаліся ўзрывамі магутнай сілы.

У ноч на 18 і 19 чэрвеня наша авіяцыя правяла эфектыўныя бамбардыроўцы нямецкія самалёты на аэрадромах у Данбасе, пад Ленінградам і паўночна-заходней Бранска. Назіраннямі адзначаны прамыя пападанні бомб у размяшчэнне нямецкіх самалётаў. Узніклі вялікія пажары.

## Дзеянні авіяцыі саюзнікаў

У ноч на 12 чэрвеня англійскія бамбардыроўшчыкі бамбардыравалі Дзюсельдорф, Мюнстэр. Днём 11 чэрвеня больш 200 амерыканскіх самалётаў бамбардыравалі Вільгельмсхафэн і Куксхафэн.

У ноч на 13 чэрвеня былі зроблены налёты на цэнтральныя раёны Рурскай вобласці.

У ноч на 18 чэрвеня бамбардыроўшчыкі „Велінгтон“ зрабілі налёт на Неапаль.

Як афіцыяльна паведамляецца, 18 чэрвеня буйныя злучэнні авіяцыі саюзнікаў зрабілі налёт на Сіцылію і Сардынію. На астравах адзначана шмат пажараў.

(ТАСС).

## Варожыя эшалоны паляцелі пад адкос

Нядаўна падрыўныя групы атрада тав. Ю. пусцілі пад адкос 4 эшалоны ворага з тэхнікай і боепрыпасамі. Разбіта 4 паравозы, 32 вагоны і 18 платформ. Пад абломкамі вагонаў пахавана больш 100 фрыцаў. Пры выкананні задання адзначыліся т.т. Ціхан Л., Саўка К., Сцяпан К., Рыгор Н., Язэп К., Лявон М., Аркадзь Б. і другія.

Праз некаторы час група байцоў пад камандай Аркадзя К. і Васіля Г. абстраляла 2 воінскіх эшалоны. Ружэйна-кулямётным агнём забіта 36 фашыстаў.

ІЗОТ А.—нач. штаба атрада.

* * *

Дыверсійныя групы Антона А. і Івана Б. (атрад тав. П.) за два дні пусцілі пад адкос 2 эшалоны праціўніка. Разбіта 2 паравозы, 12 платформ з танкамі і легкавымі машынамі, некалькі дзесяткаў вагонаў з боепрыпасамі і жывой сілай. Пры крушэнні забіта 150 фашыстаў. Рух па чыгунцы быў спынен на 39 гадзін. Смела дзейнічалі падрыўнікі Мікола Ч., Кастусь Б., Павел О., Уладзімір Л., Алесь О. і другія.

АНАТОЛЬ Ж.—камісар атрада.

## Японa-кітайская вайна

Па паведамленню агенцтва Рэйтар, кітайскія войскі ўступілі ў Чжэцзян.

Па данных кітайскага камандавання, кітайскія войскі поўнасцю занялі горад Сунцзы. Кітайскія войскі прадаўжаюць праследаваць адступаючых японцаў.

[ТАСС].

## „Мы сілы падвоім, мы храбрасць патроім, мы ворагаў іх-жа крывёю напоім“

(КАНДРАТ КРАПІВА)

## Баявы рахунак комсамола

Заўтра споўніцца 2 гады, як совецкі народ, згуртаваны вакол большэвіцкай партыі, правадыра і палкаводца тав. Сталіна, вядзе Айчынную вайну супроць нямецкіх акупантаў.

Самы актыўны ўдзел у барацьбе з ворагам прымае комсамол і ўся совецкая моладзь.

За час вайны пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі комсамол Н-скага раёна вырас у магутную баявую сілу, здольную наносіць ворагу адчувальныя ўдары.

Падвёўшы вынікі праробленай работы, раённая комсамольская арганізацыя мае на сваім баявым рахунку:

54 пушчаных пад адкос варожых эшалоны;

47 паравозаў, выведзеных са строю;

634 знішчаных і 318 пашкоджаных вагонаў з жывой сілай, боепрыпасамі, тэхнікай, гаручым і іншымі грузамі;

3673 гітлераўцы, знайшоўшых сабе магілу пад абломкамі вагонаў, у баях і ад меткіх куль з засад.

Баявы рахунак комсамола раёна расце з кожным днём.

Выхаваныя на баявых традыцыях ленінска-сталінскага комсамола комсамольцы нашых партызанскіх атрадаў ідуць у бой у першых радах. Смерцю героя загінуў у бітве комсамолец Белы Фёдар, але за смерць вернага сына помсцяць яго баявыя таварышы. Членскім узносам у комсамольскі білет Мікола Г. унёс 4 варожых эшалоны, пушчаных пад адкос, Зміцер В.—18 знішчаных гітлераўцаў. Гэтыя імёны не адзіночны, іх можна назваць дзесяткі.

На дасягнутым не спынімся. Будзем памятаць, што зробленага сёння—заўтра мала. Чырвоная Армія рыхтуецца да новых баёў з нямецка-фашысцкімі акупантамі. Наша задача—дапамагчы Чырвонай Арміі вызваліць родны край ад нямецкіх мярзотнікаў.

Комсамольцы—партызаны і партызанкі!

Узмоцнім удары па гітлераўскіх забойцах!

Па-баявому выканаем першамайскі загад тав. Сталіна!

ВЛАДЗІМІР К.—сакратар Н-скага райкома комсамола.

## Торфзавод зноў выведзен са строю

Важнае ваеннае значэнне для немцаў меў Н-скі торфзавод. Ён забяспечваў сыравінай і палівам прадпрыемствы, якія працуюць для патрэб вайны.

Днямі падрыўная група пад камандай Данілы Г. пранікла на завод і другі раз узарвала лакамабіль магутнасцю ў 350 конскіх сіл разам з усім яго абсталяваннем.

Не карыстацца тупарылым фрыцам совецкімі заводамі!—вось наш партызанскі прысуд.

ВЛАДЗІМІР А.

## Разгромлен варожы гарнізон

Нядаўна партызанскі атрад пад камандаваннем Маркі Ф. разграміў варожы гарнізон у вёсцы Б.

У баю знішчана 8 фашысцкіх ізвергаў. Народныя мсціўцы захвацілі зброю і іншыя трафеі.

У гэтай аперацыі выдатна дзейнічалі лейтэнант тав. Іосіф Г., кулямётчыкі тав. Александр З., Сяргей К. і др.

Партызаны пакляліся бязлітасна помсціць ворагам за кроў нявінных дзяцей і жанчын, за крыўды і здзекі над бацькамі, братамі і сёстрамі.

СЦЯПАН П.

## Парвалі 200 метраў чыгуначнага палатна

Выконваючы рашэнні пятага пленума ЦК КП(б)Б, падрыўная група атрада тав. А. пад камандай Васіля С. парвала 200 метраў чыгуначнага палатна на важнай варожай чыгунцы. Рух па чыгунцы на некаторы час быў спынен.

Адважна дзейнічалі падрыўнікі Сямён Т., Фёдар Л., Харытон С.

НІКАЛАЙ А.

## Удасканальваем баявую вывучку

Выконваючы першамайскі загад Вярхоўнага Галоўнакамандуючага тав. Сталіна, партызанамі атрада тав. А. праводзяцца заняткі па баявой і палітычнай падрыхтоўцы.

Ужо падрыхтавана 8 кулямётных разлікаў. Асабліва добра праводзяць заняткі па вывучэнню матэрыяльнай часткі пяхотнага аружжа т. т. Іван Т., Цімох Б. і другія.

Праведзены тактычныя вучэнні на тэму: „Падраздзяленне ў наступленні і ў абароне“ з практычным прымяненнем к умовам мясцовасці.

З вялікай цікавасцю вывучаны загады №№ 345, 95, 195 Вярхоўнага Галоўнакамандуючага тав. Сталіна. Праводзяцца масавыя чыткі мастацкай літаратуры аб Айчыннай вайне.

Будзем і ў далейшым нястомна ўдасканальваць баявую вывучку. Даб'ёмся таго, каб кожная выпушчаная куля і міна, кожны выпушчаны снарад разілі фашысцкіх варвараў.

ВІКТАР Б.

Рэдакцыйная калегія.

Выданне Окцябрскага РК КП(б)Б.